1. Гуд, А.П. Ад Каляд да Пакроваў / А.П. Гуд; под ред. Л.И. Жук. – Мн. : ТАА «Красіка-Прынт», 2000. – С. 224

2. Гульні, ігрышчы, забавы / Ред.кал.: А.С. Федосик и др. – Мн. : Бел. наука, 2003.

3. Технология социально-культурной деятельности: учеб.-метод. пособие / Л.И. Козловская [и др.] ; М-во культуры Респ. Беларусь, Белорус. гос. ун-т культуры и искусств. – Минск : БГУКИ, 2014. – С. 206

4. Ушинский, К.Д. Человек как предмет воспитания. Опыт педагогической антропологии / К.Д. Ушинский. – Ленинград: Издательство Академии педагогических наук, 1948. – Т.8. – С. 766

**Шэмянкова А.Д.,** студэнтка 550 гр.

Навуковы кіраўнік – Бяспалая М.А.

## МУЗЕЕФІКАЦЫЯ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНАЙ СПАДЧЫНЫ БОНЧ-АСМАЛОЎСКІХ (НА ПРЫКЛАДЗЕ ПУХАВІЦКАГА КРАЯЗНАЎЧАГА МУЗЕЯ)

У вёсцы Блонь цяперашняга Пухавіцкага раёна Мінскай вобласці прадстаўнікі вядомага роду Бонч-Асмалоўскіх з‘явіліся пасля падзей 1863 года, калі ў беларускіх губернях пачалі канфіскоўвацца маёнткі ўдзельнікаў паўстання. Маёмасць перахадзіла ў дзяржаўную скарбонку, а пасля распрадавалася ці даравалася лаяльным чыноўнікам. І тады Восіпу Бонч-Асмалоўскаму давялося набыць ва ўласнасць па ільготным кошце маёнтак Блонь у Ігуменьскім павеце, які быў канфіскаваны ў Антона Асоўскага за ўдзел у паўстанні і ўжо некалькі год з'яўляўся ўласнасцю Расійскай імперыі [1].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Наследаваў маёнтак сын В. Бонч-Асмалоўскага – Анатоль. Уладальнікі маёнтка сям‘я Бонч-Асмалоўскіх – гаспадар, яго жонка Варвара Іванаўна і іх дзеці, вызначыліся як добразычлівыя і разумныя гаспадары, якія з павагай ставяцца да сялян. Так, Анатоль Восіпавіч прапанаваў сялянам ва уласнасць кавалкі зямлі і інвентар, а таксама гарантаваў невялікі заробак. Быў распрацаваны статут «сацыялістычнай арцелі» верагодна, першай такога роду кааперацыі ў Беларусі [2]. Адносіны з простымі сялянамі, радыкальныя думкі вызначылі рэпутацыю гаспадароў Блоні. У іх – руках маёнтак з‘яўляўся не толькі крыніцай сродкаў, але і месцам нарад, падпольных явак, складам літаратуры, якая паступала з-за мяжы. Так, ў свой час маёнтак наведалі вядомыя прадстаўнікі народніцкага і эсэраўскага руху – М.Спірыдонава, А. Брэшко-Брэшкоўская, Г.Гершуні і г.д. [ 3, С. 131].

Лічым магчымым разгледзець дзейнасць аднаго найбольш знакамітых з роду Бонч-Асмалоўскіх − Глеба Анатольевіча Бонч-Асмалоўскага, вядомага навукоўца, гісторыка, антраполага. У маёнтку бацькі Глеб скончыў школу, затым быў навучэнцам Мінскага камерцыйнага вучылішча і Мінскай гімназіі, а пасля паступіў ў Пецярбургскі ўніверсітэт. Аўтар больш 40 навуковых прац, якія маюць вялікае значэнне для доказу пераемнай сувязі культуры і фізічнага тыпу чалавека ранняга палеаліту. Упершыню у СССР выявіў рэшткі чалавека гэтага перыяду. Падчас тых жа раскопак (Крым, 1923-1924 гг.) знайшоў скульптурныя выявы чалавека з крэмню, узростам больш за 50 тысяч гадоў, якія з‘яўляюцца першымі ў гісторыі чалавецтва прадметамі мастацтва [ 5, С. 58.].

У піцерскай кватэры, дзе ён жыў, затым працягваў жыць яго сын Андрэй і ўнучка Марыя. Менавіта яна − ініцыятар сустрэчы ў гонар 500-годдзя патомкаў роду Асмалоўскіх ў 2012 годзе ў Блоні. 30 чалавек прыехалі з розных краін: Расіі, Амерыкі, Канады, Германіі, каб пазнаёміцца са шматвякавой гісторыяй роду. Цікава, што раней ніхто з нашчадкаў, акрамя

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Марыі Андрэеўны, у Блоні не быў. Аляксандр Прановіч, дырэктар Пухавіцкага раённага краязнаўчага музея, правёў экскурсію, а таксама расказаў пра тое, хто жыў у сядзібе пасля таго, як Бонч-Асмалоўскія адмовіліся ў 1917 годзе ад маёмасці. «У сядзібе нейкі час жылі звычайныя людзі, потым тут працаваў дзяржплемзавод мясцовай гаспадаркі, затым быў адкрыты музей народнай славы. Пасля распаду савецкага саюза тут быў створаны раённы краязнаўчы музей.» Нашчадкі старажытнага роду з цікавасцю слухалі ўсе, пра што казаў падчас гэтай незвычайнай экскурсіі А.А. Прановіч, нешта запісвалі, шмат фатаграфавалі.

Марыя склала генеалагічнае дрэва ўсёй сям‘і, якое зараз знаходзіцца ў музеі. «У нейкі момант я захацела зразумець, хто я ёсць на гэтай зямлі, адкуль мае карані, кім былі мае продкі. І як толькі я пачала збіраць матэрыял для складання генеалагічнага дрэва нашай сям'і, адчула, як перада мной адкрыўся зусім іншы свет. Гэта была ўжо асобнае жыццё, якое я пражыла разам са сваімі продкамі. Я так шмат даведалася пра іх лёс, аб радасцях, смутках, пра трагедыі, што былі перажыты дзядамі і прадзедамі. Гэтая праца захапіла мяне цалкам. Яе вынік – кніга, якая рыхтуецца да выхаду ў свет, «Зямля продкаў», прысвечаная гісторыі маёй малой радзімы» – расказвала яна [4].

Падчас сустрэчы Марыя прапанавала, каб мэбля,якая належала яе знакамітаму дзеду, знаходзілася ў радавым маёнтку. Экспазіцыя адкрылася ў 2012 годзе. У музеі аднавілі цэлы пакой піцерскай кватэры, які адпавядае таму часу − працоўны кабінет Глеба Анатольевіча Бонч-Асмалоўскага. З Санкт-Пецярбурга прывезлі 12 прадметаў: пісьмовы і абедзенны сталы, люстэрка і туалетны столік пад яго, круглы столік, 2 простыя крэслы і скуранае чорнае крэсла, кніжную шафу і кніжную паліцу, шафу-буфет і навясную паліцу. Усе прадметы — XIX стагоддзя, выкананы з цёмнага дрэва з тонкай разьбой, не могуць не ўразіць, сучасных наведвальнікаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Аляксандр Прановіч, дырэктар Пухавіцкага раённага краязнаўчага музея сам ездзіў забіраць гэтую мэблю з Санкт-Пецярбурга. Усе прадметы, па яго словах, знаходзіліся ў звычайнай піцерскай кватэры тыповай дарэвалюцыйнай пабудовы: пакой плошчай 48 квадратных метраў, з высокай столлю. Атрымліваецца, што да таго, як знайсці сваё месца ў музеі, рарытэтная мэбля захоўвалася ў звычайнай камуналцы.

Цікава, што ў Санкт-Пецярбург гэта мэбля магла трапіць з Блоні (дзе і знаходзіцца цяпер). А на Пухаўшчыну, магчыма, яе маглі прывезці з Крыма. Адтуль паходзіла жонка Глеба Бонч-Асмалоўскага. Яе бацька працаваў рэктарам мясцовага ўніверсітэта — таму мелася магчымасць перадаць маладой добра зробленыя прадметы для інтэр'еру.

Акрамя мэблі прадстаўлены некаторыя рэчы, фотаздымкі ( у тым ліку і сучасных прадстаўнікоў роду), археалагічныя і антрапалагічныя прадметы з асабістай калекцыі гісторыка-археолага Глеба Бонч-Асмалоўскага, дакументы і кнігі з асабістай бібліятэкі сям'і народнікаў Бонч-Асмалоўскіх.

Сам музей прадстаўляе сабой драўляную аднапавярховую сядзібу, пабудаваную ў сярэдзіне XIX стагоддзя. Мяркуецца, што з‘явілася яна яшчэ пры Асоўскім, былым уладальніку маёнтка. Ён жа паспеў закласці маленькі парк з цэнтральнай алеяй з клёну, якая вяла да ўяздной брамы. Сядзіба і парк дастаткова добра захаваліся да нашых дзён.

Цяпер тут знаходзіцца Пухавіцкі краязнаўчы музей, дзе акрамя калекцыі рэчаў Бонч-Асмалоўскіх, сабраны: матэрыялы аб земляках удзельніках грамадзянскай вайны 1918-1920 гадоў і Вялікай Айчыннай вайны, прадметы лагераў смерці, асабістыя рэчы і ўзнагароды воінаў, партызан і Герояў Савецкага Саюза, кампазітара І. Лучанка, калекцыя малюнкаў і карцін мастака-партызана Г.Ф. Бржазовского і іншых вядомых землякоў, прадметы ручной апрацоўкі лёну і вырабы з яго XIX−XX ст.,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

калекцыя прадметаў сялянскага побыту, вырабы ткацтва, саломапляцення, разьбы па дрэве, экспазіцыя пчалярства.

У музеі не спыняюцца на дасягнутым : вывучаюць новыя факты з гісторыі роду Бонч-Асмалоўскіх, збіраюць матэрыялы і дакументы пра іх і спадзяюцца наладзіць новую сустрэчу нашчадкаў.


1. Бонч-Осмоловские в Блони [Электронны рэсурс] – Рэжым доступа: http://sozvuchie.by/news/2016-01-19 – Дата доступа: 15.03.2017.

2. Бонч-Осмоловские в Блони [Электроны рэсурс] – Рэжым доступа: https://blonmuseum.nethouse.ru/articles – Дата доступа: 15.03.2017.

3. Беспалая, М.А. Петербургский период в истории культуры Беларуси как объект музейной презентации / М.А. Беспалая // Вопросы музеологии. – 2014. − №2(10). – С. 125-133

4. Савіцкая, Л. Група Бонч-Асмалоўскага / Л. Савіцкая // Полымя. − 1967. − № 5

5. Шантыко, Е. Потомки Бонч-Осмоловских посетили музей в д. Блонь / Е. Шантыко // Пухавіцкія навіны. – 2012. – 12 сентября. − [Электронны рэсурс] – Рэжым доступа:http://www.gorka.by/?p=12288

6. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : У 6 т. Т.2. Беліцк – Гімн / Беларус. Энцыкл.; Рэдкал.: Б.І.Сачанка (гал.рэд.) і інш.; Маст. Э.Э. Жакевіч. – Мн. : БелЭн, 1994. – С. 537.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ